УДК 811.161.3:821.161.3.2

***Л. М. Мазуркевіч***

# СТРУКТУРНА-СЕМАНТЫЧНЫЯ ТЫПЫ ЗВАРОТКАЎ І СПОСАБЫ ІХ ВЫРАЖЭННЯ Ў МОВЕ ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАЎ Н. ГІЛЕВІЧА

*Артыкул прысвечаны аналізу граматычных адметнасцей і структурна-семантычных тыпаў зваротkaў, засведчаных у мове вершаваных тэкстаў Н. Гілевіча. Падкрэсліваецца, што зваротак – неад'емны структурны кампанент сінтаксічных канструкцый, асноўны сродак эмацыянальна-ацэначнай характарыстыкі адрасата.*



МГПУ им. И.П.Шамякина

Адметную ролю ў структурнай арганізацыі тэкстаў адыгрывае своеасаблівы зварот да таго, каму адрасавана змешчанае ў іх паведамленне. Традыцыйна зваротак выконвае ў маўленні некалькі функцый, асноўнымі з якіх з’яўляюцца наступныя: намінатыўная, камунікатыўная, эмацыянальна-ацэначная. Гэта абумоўлена тым, што зваротак не толькі абазначае асобу ці прадмет, да якіх непасрэдна звернута выказванне, але і характарызуе іх, змяшчае ацэнку, прыцягвае ўвагу да зместу выказвання і г. д.

Варта адзначыць, што і ў айчынным, і ў рускім мовазнаўстве па-рознаму вызначаецца сінтаксічны статус звароткa, што праяўляецца ў існаванні некалькіх падыходаў да вывучэння яго граматычнай прыроды [1]. Нягледзячы на гэта, безумоўным з’яўляецца той факт, што зваротак у сказе выконвае важную канструктыўную, а не службовую ролю. Накіраванасць (зварот) змешчанага ў сказе паведамлення да канкрэтнай асобы ці прадмета або з’явы з’яўляецца асноўнай, найбольш істотнай адзнакай звароткa як члена сказа, прызначанага для ўскладнення яго структуры [2, 29].

Прызнанне за звароткам не толькі сэнсавай, але і сінтаксічнай сувязі раскрывае сутнасць і спецыфіку гэтай канструкцыі. Безумоўна, зваротак істотна адрозніваецца ад галоўных і даданых членаў сказа не толькі характарам сінтаксічнай сувязі, але і семантычнымі, структурнымі асаблівасцямі. Адметна, што сінтаксічная сувязь, якой уводзіцца зваротак у сказ, з’яўляецца суадноснай або інтрадуктыўнай. Гэта сувязь існуе на ўзроўні сказа, а не на ўзроўні словазлучэння, як дапасаванне, кіраванне ці прымыканне: яна больш свабодная, аслабленая, часцей за ўсё неабавязковая. І гэта заканамерна, бо яна рэалізуецца паводле сэнсу і граматычнай суадноснасці звароткa з іншымі членамі ў сказе [2, 29].

Актыўнае выкарыстанне звароткa стала адметнай адзнакай сінтаксісу паэтычных твораў беларускага мастака слова Н. Гілевіча. Адрасатам паведамлення ў мове вершаваных твораў яго часцей за ўсё выступае асоба чалавека, радзей – жывая істота, неадушаўлёны прадмет або з’ява, прычым зварот да неадушаўлёных прадметаў, абстрактных паняццяў і геаграфічных назваў адбываецца пры персаніфікацыі іх: *Тваю трагедыю, Лагойшчына, / Што будзе помніцца да скону, / Ён не пакіне неадпомшчанай / І не даруе анікому!* [3, 71]; *Што я наважыўся одумам сваім – / Я паўтару табе як клятву нанач. / А покуль што стаю ў цішы хваін / І слухаю тваё дыханне, Нарач*[3, 58]; *Столькі зведаўшы гора, нягод, / Столькі слёз, і крыві, і агню – / Беларусь, ты на тысячы год Заслужыла сабе цішыню* [3, 96]; *Вось гэтак, дзеткі, і ў жыцці: / Пакуль мы церпім, людзі, – / Як ні круці і ні вярці – / Смярдзюк смуродзіць будзе* [4, 8]; *Браток, – пусціў слязу калега, – / Дзеля малых прашу дзяцей, / Каб ты замест мяне паехаў: / Ты ж халасцяк! Табе прасцей!* [4, 92]; *І так штодзень, і так штодзень: / “Жывей, жывей, мой Кузя!..” / Кузьма*



МГПУ им. И.П.Шамякина

*асунуўся, схудзеў, / Сцялося сэрца ў вузел* [4, 78]; *Сядайце, – кажа мне, – ў карэце, / І папрашу, грамадзянін: / Як будзем ехаць – не дурэйце: / Я – мнагадзетны сем'янін* [4, 84].

У большасці выпадкаў у ролі звароткаў шырока выкарыстоўваюцца назоўнікі, якія абазначаюць асоб паводле роднасці і сваяцкіх адносін, роду заняткаў, займаемай пасады, сацыяльнай прыналежнасці, узросту і імені, якой-небудзь знешняй ці ўнутранай прыкметы, уласцівасці характару і г. д.

У вылучаных сінтаксічных канструкцыях дастаткова часта ў якасці зваротка ўжываюцца словы з так званай нязменнай функцыяй, у выніку частага выкарыстання асобныя з іх страцілі сваё лексічнае значэнне і традыцыйна называюць любую асобу, да якой звяртаюцца: *Толькі пырскі ўбакі. / Як сонца жывыя асколкі. / Наперад, васпане! Смялей за буйкі! / Ні страху, ні стомы – нікольkі!*; *Э-э, братка-братачка, каб мог я / Заразу гэтую глытаць – / Я б за здароўе бабы Зохвы – / Быў рад і ў бутлі дна дастаць!*; *Братка мой! / Братка мой! / Братачка родны! / Адкажы – сам сабе адкажы: / Чым зрабіўся табе непрыгодны / Скарб бясцэнны тваёй жа душы?* і інш.

Звароткі звычайна складаюцца са слоў або словазлучэнняў, якія структурна арганізаваныя, граматычна незалежныя, інтанацыйна вычлененыя ў асобную канструкцыю ў межах простага ці складанага сказаў (па-за межамі сказа яны сустракаюцца рэдка, што абумоўлена зместам, будовай, рытмікай і мелодыкай саміх твораў). Паводле свайго сэнсу звароткі заўсёды звязаны са сказам і без яго самастойна не ўжываюцца: яны ўключаюцца ў сказ або знаходзяцца пры сказе для адпаведнай характарыстыкі яго зместу і служаць адным з дзейсных сродкаў вобразнага адлюстравання рэчаіснасці [2, 28]: *Што ты пішаш, баламутнік, / Аб гісторыі далёкай! – / Закрычаў у злосці лютай / Пані Догмы верны лёкай* [4, 31].

Разгледжаны матэрыял дазваляе сведчыць, што зваротак не мае пастаяннага месца ў сказе. Ён можа размяшчацца ў пачатку сказа, у сярэдзіне ці ў канцы яго. Традыцыйна месца зваротка ў сказе абумоўлена яго актуальнасцю, лагічным і інтанацыйным выдзяленнем: пры большай актуалізацыі ён звычайна размяшчаецца ў пачатку, пры меншай – у сярэдзіне ці ў канцы сказа. Адначаюцца адзінкавыя выпадкі ўжывання зваротка па-за межамі сказа, што адбываецца пры ўмове асаблівай актуалізацыі яго: *Дзівак! Нясмелы дурань! / Ці ж можна з гэткім паляцець?.. / Успамінай цяпер і думай – / Пра заўтра думай, целяпень!* [3, 25]. Знаходзячыся па-за межамі сказа, зваротак тым не менш не губляе з ім сэнсавайсувязі.

Паводле структуры ў паэтычных творах Н. Гілевіча фіксуюцца неразвітыя або развітыя звароткі. Неразвітыя звароткі выражаюцца пераважна назоўнікамі ў форме назоўнага ці былога клічнага склону. У такім выпадку яны звычайна абазначаюць асоб, жывых істот, прадметы



МГПУ им. И.П.Шамякина

і з’явы: *Цудоўна, дружа! / Перспектыўна дужа. / Калі мы здзейснім – а мы здзейснім! – план, / Прадбачу нават, як падскочыць тут жа / Каэфіцыент душэўнага цяпла* [5, 38]; *Яна нямела, абмірала / І, як у трызненні, у сне, / Адно бясконца паўтарала: / “Забіў ты, Сцёпачка, мяне!..”* [5, 52]; *За ўзмахам узмах – / Толькі пырскі ўбакі. / Як сонца жывыя асколкі. / Наперад, васпане! Смялей за буйкі! / Ні страху, ні стомы – ніколькі!* [3, 32]; *Углядайся, сыне, пільней углядайся, / У святыя абрысы бацькоўскай зямлі. / На чужыя спакусы душой не паддайся, / Каб нашчадкі мяне за свой лёс не клялі* [3, 34]; *“Чаго ён дзярэцца? Малы я ці што? / А йдзі ты, таварыш, да д’ябла! / Не шныраць акулы. Не блізіцца шторм…” / І зноў я махаю заядла* [3,33].

У структуры сказаў развітыя звароткі арганізуюцца словаспалучэннямі назоўнікаў у форме назоўнага ці былога клічнага склонаў або субстантываваных прыметнікаў і залежных ад іх слоў іншых часцін мовы. Такія звароткі вызначаюцца большай семантычнай напоўненасцю, у выніку чаго дасягаецца разгорнутая характарыстыка абазначаных імі адушаўлёных ці неадушаўлёных прадметаў і з’яў. Пры назоўніку ў якасці залежнага кампанента могуць знаходзіцца або прыметнікі (пераважна якасныя): *І зноў стары заплюскаў нечакана / І пацягнуўся да вачэй хусцінкай. / А мы стаім, працятыя пытаннем: / “Чаго ж ты плачаш, добры чалавек?”* [5, 48]; *О мілыя трывогі! / Дарма тужу, дарма! / Назад да вас дарогі / Ад гэтых гурб – няма* [3, 21]; *Ах, сонечныя гурбы! / Калі вас намяло? / Пасіверылі губы, / Пасеклася чало* [3, 20], або прыналежныя займеннікі: *Братка мой! / Братка мой! / Братачка родны! / Адкажы – сам сабе адкажы: / Чым зрабіўся табе непрыгодны / Скарб бясцэнны тваёй жа душы?* [3,51];*Ты дзівішся, суседачка мая, / Чаго так раптам паблажэла я? / Дзве тысячы мне трэба да зарэзу – / І ні да кога ў доўг я не ўлезу!* [6,143];*Яна, мой браце, з тых кароў, / Што век не запускаецца. / Таму і процьма даяроў / Каля яе ўвіхаецца* [4,19];*Брат мой! / Кроў Леўскага ў жылах пульсуе маіх! / Кроў Каліноўскага ў сэрцы стукоча тваім!* [3, 15] ці ўвогуле паралельнае ўжыванне адзначаных спалучэнняў:*“Бывай, мая мамачка!”, “Матанька родная!” / “Даруй мне, матулька!”, / “Не плач па мне, мама”, / “Матуленька, дзе ты? Ці ўбачымся зноў?..”* [3, 26].

Зрэдку ў вершаваных радках ужываюцца звароткі, утвораныя па мадэлі “прыналежны займеннік + прыметнік(і) + назоўнік”: *Мой сіні бор, мой родны бор зялёны! / Ён ёсць у кожнага – свой бор, што вабіць, / Свой мілы кут, свае бярозы й клёны, / І ёсць свая лясная тайна, мабыць…* [3, 10]; *Як ты грымела, як бабахала, / Мая рабінавая ноч! / Стокрылы вецер дол аблахаваў / І вобзем кінуўся наўзбоч* [3, 8]; *Не пакідай мяне, мой светлы сум, / З табой мне хораша на адвячорку / Хадзіць і слухаць лесу ціхі шум, / Пакуль суцемак не запаліць зорку* [3, 9], што дазваляе пісьменніку дасягнуць большай вобразнасці і эмацыянальнай выразнасці. З акрэсленай

МГПУ им. И.П.Шамякина

мэтай фіксуюцца і выпадкі ўжывання паўторных назоўнікаў: *Зрываць красу – пабойся бога! / Пялёсткам сум не залячыць! / Ах, павядзі мяне, дарога-дарожка, / Ад гэтай казкі ўдалячынь!* [3, 28]; *Э-э, братка-братачка, каб мог я / Заразу гэтую глытаць – / Я б за здароўе бабы Зохвы – / Быў рад і ў бутлі дна дастаць!* [3, 212].

Неразвітыя і развітыя звароткі могуць быць аднароднымі (злучнікавымі ці бяззлучнікавымі): *Даруйце, родныя бары і пушчы, / Зямлі бацькоўскай неацэнны скарб, / Што – не глухі і не сляпы – відушчы – / Не чуў, не бачыў вашых слёзных скарг* [3, 36] і неаднароднымі, калі характарызуюць прадмет ці паняцце па рознай прыкмеце, выконваючы ўдакладняльную функцыю: *Прыпазніўся з хлопцамі / На дзядзінец бацька. / "Дзе ты, маё золатца, / Каснічок чырвоны?.."* [3, 69].

У залежнасці ад спосабу ўжывання вылучаныя ў паэтычных радках Н. Гілевіча развітыя звароткі бываюць адзіночныя, паўторныя і групавыя. Адзіночны зваротак традыцыйна адрасаваны адной асобе або прадмету і ўжыты ў сказе адзін раз: – *Сцяпан Якубавіч, хачу я / Табе бяду сваю адкрыць. / Няхай душа твая пачуе, / Як мне нялёгка гаварыць* [3, 38]; – *Сцяпан, – зірнуў Тамаш на брата, – / Ты так гаворыш, як бы тут / Сабралі тых, хто вінаваты, / І ты выносіш ім прысуд* [3, 178]; *Крыху няёмка стала Лёдзі – / Аж злосць мільгнула на губе: / – Ну, муж, калі б не пры народзе – / Ой благавухнула б табе!..* [3, 256]; *Сцяпан на момант прыпыніўся, / Абвёў паглядам шыр – прастор. / "Эгей, мой кут, як ты змяніўся! / Стаў роўны й гладкі – нібы стол…"* [3,164]; *Пра цябе і радзіму – адна ў мяне дума і думачка, / Хоць малітвы маёй ты за даллю далёкай не чуеш / І не знаеш, як горача, як апантана шапчу я: / " Спі, мая лугавая, мая залатая мядуначка!"* [3,37];*Удава – уголас: / Дочанька мая! / Сцерпі гэту ганьбу – / Што табе зашкодзіць?!..* [3,67];– *Казачэнька мой міленькі, / Чым мы будзем умывацца? / – Ой, я расою, а ты слязою, / Мілая, любая мая!* [3, 90].

Паўторны зваротак ужываецца ў сказе некалькі разоў з мэтай узмацнення яго і дасягнення асаблівай эмацыянальнай выразнасці: *Пераступіць бы тую плётку, / Разумна разам абмінуць… / Ах, Аля, Аля! Як жа лёгка / Далі сябе мы абмануць!..* [3, 265]; – *Мар'яна! – клікнула – Мар'яна! – / І зразумела, што дарма: / Пасцель была не рассцілана. / Дачкі няма! Яе няма!* [3, 234];*Вярблюд, вярблюд, паслухай, / Гарбаты дурань мілы: / Ты ж калісь вельмі здорава / Плявацца ўмеў, вярблюд?* [4,18];*О, дзеці, дзеці! Дзе мне вочы дзець? /Каб вам у вашы вочы не глядзець?* [3, 49];– *Moська, Moська, на –на – на! / – Хто там кліча Моську? / Мемуары пра слана / Я пішу патрошку* [7,27].

Групавыя звароткі адрасаваны розным асобам ці прадметам. У сваім аб'яднанні яны ўтвараюць аднародны рад (злучнікавы або бяззлучнікавы): *Ды ні гуку над Гайнай – пад цёмным шатром. / Толькі зоркі – як вочкі Купаліны. / Дзе ж вы, хлопцы, дзяўчаты? Чаму за сялом / Над ракою, агні*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*не запалены?* [3,31];*Тады і даў каманду хтосьці: / – Дзяўчаты! Бабы! Песні дзе? / Ці нас пазвала свята ў госці – / Ці мы сабраліся ў бядзе?* [3, 218]; – *Цішэйце, бабы! Волька! Зіна! / Ішлі б кудахтаць за парог!.. / – У гонар маці – песня сына! – / Гукнуў яшчэ раз Крутагор* [3, 218].

Такім чынам, звароткі, засведчаныя ў мове паэтычных твораў Н. Гілевіча, з'яўляюцца важнымі структурнымі кампанентамі, якія развіваюць структуру сказа, узбагачаюць змест яго, часта служаць актуалізаваным зачынам. Акрамя таго, звароткі не толькі называюць тых персанажаў (адушаўлёных і неадушаўлёных), якім адрасуецца паведамленне, але і пэўным чынам характарызуюць іх, настройваючы чытача на ўспрыняцце і ўключэнне ў атмасферу выказвання.

Літаратура


1. Капцюг, І. У. Сінтаксічныя ўласцівасці зваротка: гістарыяграфічны аспект / І.У. Капцюг // Весці БДПУ. Сер. 1. – 2005. – № 2. – С. 65–68.
2. Бурак, Л. І. Зваротак у беларускіх жніўных песнях / Л. І. Бурак // Веснік БДУ. Сер. 4. – 1994. – № 3. – С. 28–33.
3. Гілевіч, Н. Вечны матыў / Н. Гілевіч. – Мінск: Юнацтва, 1994.
4. Гілевіч, Н. Кантора: сатыра і гумар / Н. Гілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 110 с.
5. Гілевіч, Н. Выбраныя творы ў двух тамах. / Н. Гілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1991. – Т. 1: Вершы, паэмы, п'есы. – 478 с.
6. Гілевіч, Н. Ёсьць зямля... / Н. Гілевіч. – Менск: Белфранс, 1997.
7. Гілевіч, Н. Збор твораў / Н. Гілевіч. – Мінск: Маст. літ., 1999. – Т. 2: Вершы і паэмы 1977–1992; Родныя дзеці: раман у вершах. – 355 с.


МГПУ им. И.П.Шамякина